# Гомельскі універсітэт

ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

№ 20 (807) | Серада, 5 чэрвеня 1991 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць раз у тыдзень | Цана 3 кап.


## НА ВУЧОНЫМ САВЕЦЕ

30 мая адбылося чарговае пасяджэнне Вучонага савета універсітэта. Першым на парадку дня было абмеркавана пытанне аб стане і мерах па ўдасканальванню гуманітарызацыі адукацыі. З дакладам выступіў прарэктар па завочнаму навучанню М. М. Воінаў. Прынята адпаведнае рашэнне.

Па дакладах дэканаў біяфака В. Я. Верамейчыка і геафака А. П. Пінчука заслухана пытанне аб арганізацыі і правядзенні на гэтых факультэтах вучэбных і вытворчых практык.

Адным з важнейшых на Вучоным савеце было пытанне аб устанаўленні надбавак да пасадавых акладаў прафесарска-выкладчыцкаму саставу і ўсім астатнім катэгорыям работнікаў. Яны ўводзяцца з 1 красавіка г. г. ў размеры ад 30 да 50%. Пераразлік і выплата сум па новых акладах і надбаўках будзе ажыццёўлена 2 ліпеня, так як патрэбен значны час для правядзення атэстацыі і пераатарыфікацыі, выканання аб'ёмістай тэхнічнай работы.

Аб новых пасадавых акладах і надбаўках у наступным нумары нашай газеты раскажа чытачам галоўны бухгалтар універсітэта І. А. Курава.

На Вучоным савеце праведзены выбары па конкурсу на вакантныя пасады, выбрана атэстацыйная камісія універсітэта, разгледжаны пытанні аб дэпаніраванні навуковых работ і змяненнях у вучэбным плане гістарычнага факультэта, зацверджана тэма кандыдацкай дысертацыі.



Дзяржаўны экзамен па грамадскіх навуках на завочным аддзяленні факультэта фізічнай культуры. Свой рэферат абараняе Сяргей Касінскі.
Фота У. Чысціка.

## АКЦЫЯ МІЛАСЭРНАСЦІ

У адзін з выхадных майскіх дзён у г. Гомелі адбылося свята дзяцінства. У яго рамках абласное аддзяленне Савецкага дзіцячага фонду арганізавала марафон на карысць малазабяспечаных апякунскіх, мнагадзетных сем'яў, дзяцей-сірот і дзяцей-інвалідаў. У гэтай акцыі міласэрнасці прымалі ўдзел і дзеці, і дарослыя. Першыя падрыхтавалі для яе прадукцыю, выробленую сваімі ўласнымі рукамі — распісныя раздзелачныя дошкі, сурвэткі, іншыя разнастайныя рэчы, якія хутка і з ахвотай раскупляліся. Рабяты выступілі таксама на сцэне Палаца культуры будаўнікоў ВА «Гомельпрамбуд» з канцэртам мастацкай самадзейнасці. Другія ж — і асобныя грамадзяне горада, якім неабыякавы лёс нашых дзяцей, і прадстаўнікі працоўных калектываў адзін за адным выходзілі на сцэну Палаца і гаварылі, чым непасрэдна яны могуць дапамагчы ім. Гэта і пералічэнне грашовых сум для асацыяцыі сем'яў, у якіх выхоўваюцца дзеці-інваліды, на іх лячэнне, і перадача ім вітамінвай прадукцыі, медыкаментаў, выдзяленне для маці з дзецьмі з малазабяспечаных сем'яў пуцёвак для адпачынку і аздараўлення і многае іншае.

Актыўны ўдзел у марафоне прынялі таксама выхаванцы нашага універсітэта. Так, студэнты фізічнага, біялагічнага і завочнага факультэтаў, а таксама члены клуба маладой сям'і «Бусел» сабралі 230 рублёў і перадалі іх на лячэнне 5-гадовай Кацюшы Лапіцкай. А слухачы народнага універсітэта маральна-эстэтычнага выхавання перадалі для ўдзелу ў аўкцыёне, які таксама адбыўся ў гэты ж дзень, карціну «Восеньскі пейзаж». Выручаныя грошы яны ўручылі В. Чуяшовай, бацька якой загінуў у Афганістане.

Гэта вельмі важна, што сэрцы людскія яшчэ не ачарсцвелі, блізка ўспрымаюць чужое гора і клопаты. Усім нам неабходна падтрымліваць адзін аднаго, і, ў першую чаргу, нашу будучыню — дзяцей — у такім няпростым сённяшнім жыцці.

## ФІЛІЯЛ ІНЖЫНЕРНАЙ АКАДЭМІІ

21 мая выканком гарадскога Савета народных дэпутатаў зарэгістраваў Гомельскі філіял Інжынернай акадэміі СССР. Старшынёй прэзідыума гэтага філіяла выбраны рэктар Гомельскага політэхнічнага інстытута доктар тэхнічных навук, прафесар А. С. Шагінян. Філіял інжынернай акадэміі часова размясціўся ў галоўным корпусе ГПІ.

Карэспандэнт нашай газеты звярнуўся да першага намесніка старшыні прэзідыума Гомельскага філіяла Інжынернай акадэміі СССР члена-карэспандэнта гэтай акадэміі, загадчыка кафедры аналізу гаспадарчай дзейнасці нашага універсітэта, доктара эканамічных навук, прафесара В. Е. Цішчанкі з просьбай расказаць аб прызначэнні і задачах створанага філіяла.

— Гомельскі філіял Інжынернай акадэміі СССР,— сказаў Віктар Елісеевіч, — з'яўляецца грамадскай, гасразліковай і самастойнай у гаспадарча-эканамічных адносінах навукова-тэхнічнай арганізацыяй, дзейнічаючай на падставе заканадаўчых актаў Беларусі, Саюза ССР і статута.

Мэта філіяла — аб'яднанне найбольш творчай і перадавой часткі інжынераў і вучоных Гомельшчыны для правядзення перспектыўных даследаванняў і распрацовак на аснове дасягненняў фундаментальных навук і стварэння прынцыпова новых відаў тэхнікі, тэхналогій і матэрыялаў, якія маюць важнае народнагаспадарчае значэнне і дазволяць паскорыць навукова-тэхнічны прагрэс.

Мы будзем прагназіраваць тэмпы развіцця і ўдасканалення навукова-тэхнічнага патэнцыялу народнай гаспадаркі вобласці, вызначаць прыярытэтныя напрамкі гэтага развіцця, займацца распрацоўкай прапаноў па мадэрнізацыі яго вытворча-тэхнічнай структуры.

Адной з задач філіяла з'яўляецца правядзенне незалежнай грамадскай тэхніка-эканамічнай экспертызы абласных, рэспубліканскіх і дзяржаўных праграм, праектаў і іншых важнейшых рашэнняў, распрацовак тэхналогій, матэрыялаў новай тэхнікі, сістэм і сродкаў кіравання. Будзем займацца таксама распрацоўкай сучасных метадаў разлікаў машын, абсталявання, прыбораў для розных галін народнай гаспадаркі, сродкаў для рэалізацыі гэтых разлікаў і выпрабаванняў тэхнікі і матэрыялаў, апрабацыяй і рэалізацыяй перспектыўных вынаходніцтваў і распрацовак. У пастаянным полі зроку будзе знаходзіцца распрацоўка прапаноў па зместу і арганізацыі вышэйшай інжынернай адукацыі, каардынацыя навукова-метадычнай дзейнасці па падрыхтоўцы і перападрыхтоўцы інжынерных кадраў.

Прадугледжана надаваць важнае значэнне міжнароднаму супрацоўніцтву, прадстаўленню інтарэсаў інжынернага супольніцтва ў СССР і за яго межамі, прапагандзе і распаўсюджванню навукова-тэхнічных дасягненняў, адраджэнню і ўмацаванню прэстыжа прафесіі інжынера, яе грамадскай значнасці.

У ліку асноўных і задача па распрацоўцы і рэалізацыі на практыцы эфектыўных форм кансалідацыі навуковай і інжынернай грамадскасці, павышэння сацыяльнага статуса і абароны прафесіянальных інтарэсаў інжынераў.

## СТУДЭНЦКІ ФОНД СТВОРАНЫ

Здаецца, даўнія планы па стварэнню дабрачыннага студэнцкага фонду пачынаюць паступова ажыццяўляцца. У канцы мая трое заснавальнікаў (ЦК ВЛКСМ, ЦК КПСС і Міністэрства працы і сацыяльных пытанняў СССР) падпісалі асноўныя дакументы па стварэнню студэнцкага фонду.

«Студэнт сам у стане зарабіць кучу грошай, — лічыць адзін з арганізатараў фонду Ю. Цімашоў. — Наша задача стварыць са студэнцкіх фірм з дапамогай ільготнага падаткаабкладання рэжым найбольшага эканамічнага спрыяння. А ўжо за кошт свайго прыбытку гэтыя фірмы будуць самастойна аказваць дапамогу тым студэнтам, якія маюць у ёй вострую патрэбу».

(«Комсомольская правда», № 117—118 за 1991 г.).

## ВІНШУЕМ!

Рэктарат і грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат філалагічнага факультэта, кафедра беларускай літаратуры горача віншуюць асістэнта гэтай кафедры НОВАК Валянціну Станіславаўну з зацвярджэннем яе ВАКам у вучонай ступені кандыдата філалагічных навук.

## БУДЗЕ АКАЗАНА МАТЭРЫЯЛЬНАЯ ДАПАМОГА

Студэнтам, якія не маюць аднаго ці абодвух бацькоў;

— студэнтам са шматдзетных сем'яў (чацвёра і больш дзяцей);

— студэнтам, якія маюць дзяцей, у бягучым месяцы будзе выплачвацца аднаразовая матэрыяльная дапамога ў размеры 120 руб.

Для яе атрымання неабходна прадставіць пацвярджаючыя дакументы ў камітэт камсамола універсітэта (галоўны корпус, п. 1-15, т. 57-16-45) да 11 чэрвеня г. г.

## ДА ЎВАГІ СТАРШЫНЬ ПЯРВІЧНЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ ТАВАРЫСТВА «ВЕДЫ» І ЗАГАДЧЫКАЎ КАФЕДР

6 чэрвеня ў парткоме універсітэта адбудзецца пашыранае пасяджэнне прэзідыума праўлення арганізацыі таварыства «Веды» ГДУ па выніках цыклавых чытанняў 1990—1991 года і развіццю сістэмных форм лектарскай работы. У ім прымаюць удзел рэферэнты Гомельскай абласной арганізацыі таварыства «Веды».

Просьба падрыхтаваць прапановы па ўдасканальванню сістэмных форм лектарскай работы.

Пачатак — у 14 гадзін.

ПРЭЗІДЫУМ ПРАЎЛЕННЯ ТАВАРЫСТВА «ВЕДЫ» ГДУ.

*Да 50-годдзя пачатку Вялікай Айчыннай вайны*

# З ПЕРШАГА І ДА АПОШНЯГА ДНЯ

**17 дзён застаецца да 22 чэрвеня. У гісторыі нашай краіны гэтая дата сёлета — юбілейная, хаця і сумная. Паўстагоддзя назад гітлераўская Германія вераломна напала на Савецкі Саюз. Пачалася Вялікая Айчынная вайна. Для савецкіх людзей яна закончылася пераможна, але прынесла шматмільённыя чалавечыя страты. Ад гэтага і цяпер болем шчымяць нашы сэрцы.**

**Мы нізка схіляем галовы перад тымі, хто каваў Вялікую Перамогу. Перад жывымі і загінуўшымі. Подзвіг герояў Вялікай Айчыннай будзе жыць праз вякі.**

**Праз мінулыя пасля вайны гады прыкметна парадзелі рады яе ўдзельнікаў. Таму іх успаміны аб былых баях і паходах для сённяшняга маладога пакалення з'яўляюцца неперааацэннымі.**

**З гэтага нумара газеты мы даем слова тым, хто прайшоў праз пекла самай крывавай вайны**

ВЕРАЛОМНЫ напад гітлераўскай Германіі 22 чэрвеня 1941 года на нашу краіну абарваў мірнае жыццё савецкіх людзей. Першымі прынялі на сябе ўдар ворага пагранічнікі... Тады, паўстагоддзя назад, я быў байцом і пазаштатным санінструктарам пагранзаставы.

На світанні таго трагічнага дня з першых мінут 12-я застава, дзе я служыў, апынулася ў самым пекле вайны. Праціўнік спрабаваў з ходу авалодаць мастом праз пагранічную раку Прут. Але старшына Навумаў, радавыя Агаеў і Шмакаў, якія ахоўвалі ў тую ракавую ноч подступы да маста, цаной свайго жыцця спынілі ворага.

Я дзейнічаў у групе палітрука Ляпёшкіна. Яна адбівала шалёныя атакі фашыстаў, якія хацелі прарвацца да нашага цэнтральнага блакгауза. Побач адбівалі націск праціўніка чатыры байцы на чале з сяржантам Кісляковым. У грукаце выбухаў, стракатанні кулямётна-аўтаматных чэргаў даносіўся падбадзёрваючы голас начальніка заставы лейтэнанта Вятчынкіна.

Адзінаццаць сутак застава абараняла свой рубеж на пярэднім краі сваёй зямлі. Страты былі вялікія. Многім параненым я аказваў першую дапамогу. Тут, на граніцы, разам з сябрамі я прыняў баявое хрышчэнне. А наперадзе былі яшчэ бясконцыя дні і ночы вайны.

Здарылася так, што нешта запісваць я пачаў з першых дзён вайны, таму што разумеў значэнне перажытага і хацеў замацаваць у памяці. Але пры адступленні запісы даводзілася знішчаць — маглі трапіць у рукі немцаў. А адзін сшытак, пачаты ў перадгор'ях Каўказа, на дзіва, захаваўся. Гэты сшытак ў жоўтых цыратовых вокладках захоўваецца ў Гомельскім музеі. За вокладкай на зеленаватай старонцы буйнымі літарамі выведзена: «Нататкі аб вайне».



**На здымку: А. Калугін у перыяд вайны.**

На адной са старонак дзённіка запісана: «18 жніўня 1942 года, калі наш пагранічны полк з апошніх сіл біўся з фашысцкай дывізіяй «Эдэльвейс», якая рвалася да перавалаў і далей да Чорнага мора, у дзённіку зроблены такі запіс: «Няхай нас натхніць вобраз вялікага Суворава і яго воінаў, якія штурмавалі Альпы...».

Доўгі і вельмі цяжкі прайшоў я шлях вайны. Асабліва цяжка было ў першыя часы вайны на граніцы і на Каўказскіх перавалах у 1942 годзе. Я добра памятаю, як адарваныя ад тылавых баз на вышыні 3500—4000 м над узроўнем мора на заснежаных скалах мы цярпелі і голад, і холад, не адны суткі былі на так званым «подножном корме». Гэта мерзлыя ягады і такія ж грыбы. У нас былі зношаныя абмундзіраванне і абутак. Нягледзячы на гэта, спецыяльна сфарміраваны атрад пагранічнікаў правёў дзесяцідзённы рэйд па тылах немцаў, моцна патрапаў іх базы, лініі сувязі і сабраў важныя звесткі аб праціўніку. Амаль усе ўдзельнікі гэтага рэйду, уходзячы ў тыл ворага, падалі заявы аб прыёме ў партыю. Тады ж стаў камуністам і я. У заяве напісаў: «Калі загіну — лічыце камуністам». Мы не шукалі сабе кар'еру, уступаючы ў партыю, мы змагаліся з лютым ворагам, абаранялі Бацькаўшчыну, стаялі насмерць.

Пасля таго, як Паўночны Каўказ быў ачышчаны ад гітлераўцаў, наш полк, узнагароджаны за доблесць і мужнасць, праяўленыя ў баях, ордэнам Чырвонага Сцяга, удзельнічаў у вызваленні Кубані, Данбаса, Херсона, Адэсы, Нікалаева і інш. Подзвігі яго воінаў на ніжнім Дняпры былі адзначаны прысваеннем палку ганаровай назвы Ніжнедняпроўскага. А затым, пасля фарсіравання каля Ізмаіла р. Дунай у баявых парадках войск 3-га Украінскага фронту, мы перайшлі дзяржаўную граніцу. Свой франтавы шлях я закончыў у майскія дні 1945 года ў аўстрыйскім горадзе Юдэнбургу.

**А. КАЛУГІН,**
**доктар медыцынскіх навук, прафесар біялагічнага факультэта.**

# КАНЦЭПЦЫЯ АБНАЎЛЕННЯ ТАВАРЫСТВА «ВЕДЫ» БССР

**(ПРЫНЯТА XI (НЕЧАРГОВЫМ) З'ЕЗДАМ ТАВАРЫСТВА «ВЕДЫ» РЭСПУБЛІКІ Ў СТУДЗЕНІ Г. Г.**

Формы, метады, змест і тэматычная накіраванасць дзейнасці, арганізацыйная структура Таварыства не адпавядаюць у поўнай меры кардынальным зменам, якія адбываюцца ў працэсе перабудовы, абнаўлення ўсіх сфер грамадскага жыцця.

Таварыства не змагло хутка перабудавацца ва ўмовах фарміравання прававой дзяржавы і станаўлення рэальнай шматпартыйнасці, аказалася не гатовым да функцыяніравання ў якасці самакіруемай асветніцкай арганізацыі. Арганізацыі Таварыства з цяжкасцю адаптуюцца да ўмоў рынкавых адносін, да жорсткай канкурэнцыі.

Цяжкасці, што склаліся, парадзілі ў радах Таварыства і за яго межамі «ліквідатарскі» настрой, сумненні ў мэтазгоднасці яго захавання як грамадскай асветніцкай арганізацыі. Ва ўмовах, калі аб'ектыўна ў жыцці грамадства ўзрастае роля навуковых ведаў, інтэлектуальнага фактару, такое «рашэнне праблемы» уяўляецца непрымальным. Таварыства «Веды» валодае вялікім інтэлектуальным патэнцыялам, у цэлым дзеяздольным саставам практычных работнікаў. Задачы фарміравання новага эканамічнага, палітычнага і прававога мыслення, павышэння грамадскай каштоўнасці навукі, адукацыі, культуры, прафесіянальнай падрыхтоўкі патрабуюць глыбокага, карэннага абнаўлення Таварыства, стварэння прынцыпова новай яго мадэлі.

У палітычнай сістэме, што абнаўляецца, Таварыства заклікана:

— аказваць усебаковую падтрымку дзяржаўным і грамадскім арганізацыям у рашэнні задач сацыяльна-эканамічнага развіцця рэспублікі, ва ўсталяванні яе суверэнітэту ў складзе абноўленага Саюза, у фарміраванні прававой дзяржавы;

— садзейнічаць нацыянальнаму адраджэнню беларускага народа, аб'яднанню, кансалідацыі дэмакратычных сіл, дасягненню грамадзянскай згоды;

— актыўна ўдзельнічаць у працэсе фарміравання гарманічна развітай, духоўна багатай, грамадска-актыўнай асобы.

У сферы грамадска-палітычных ведаў неабходна рашучае адмаўленне ад дагматызму і схаластыкі. У цэнтры ўвагі павінны быць праблемы новага мыслення, сацыяльнай абароны асобы, актуальныя пытанні развіцця рэспублікі, краіны, сучаснага свету. Асаблівая ўвага — гісторыі і культуры Беларусі, рэалізацыі Закона аб мовах у БССР.

Задачы ў галіне прыродазнаўчых і навукова-тэхнічных ведаў — больш эфектыўна выкарыстоўваць вынікі навукі і тэхнікі ў інфармацыйных, адукацыйных, укараняльных працэсах, дабівацца больш арганічнай іх увязкі з рашэннем практычных задач; актыўны ўдзел у ажыццяўленні комплекснай праграмы ліквідацыі вынікаў аварыі на Чарнобыльскай АЭС.

Гуманітарызацыя зместу дзейнасці таварыства «Веды» азначае распаўсюджванне культуры ў самым шырокім сэнсе слова, задавальненне разнастайных інтэлектуальных запытаў, фарміраванне высокай духоўнасці і маральнасці людзей.

Патрабуецца якасна новая сістэма арганізацыі дзейнасці Таварыства:

— арыентацыя перш за ўсё на грамадскія патрэбы ў пэўных, канкрэтных ведах, на пазнавальныя, інфармацыйныя, адукацыйныя інтарэсы працоўных калектываў;

— укараненне, у тым ліку на гаспадарчай разліковай аснове, інфармацыйна-навучальных, доследных, экспертных, навукова-тэхнічных, інжынерна-укараняльных цэнтраў, і кааператываў, навуковых і вытворчых аб'яднанняў, малых і сумесных прадпрыемстваў і г. д.;

— расшырэнне рэкламна-інфармацыйнай работы аб магчымасцях, якімі валодае Таварыства ў сферы распаўсюджвання ведаў, з выкарыстаннем сродкаў масавай інфармацыі, праз аўкцыёны і прэзентацыі ведаў, кірмашы навукова-тэхнічных ідэй;

— развіццё сувязей, прамых кантактаў з зарубежнымі асветніцкімі арганізацыямі і цэнтрамі;

— умацаванне фінансавага стану, матэрыяльна-тэхнічнай базы Таварыства; неабходная ва ўмовах рынкавых адносін сацыяльная абарона яго членаў.

У цэнтры ўвагі Таварыства павінна знаходзіцца фігура лектара — грамадскага работніка.

Трэба прадаставіць лектарам, здольным дзейнічаць ва ўмовах рынкавай эканомікі і палітычнага плюралізму, права ствараць інфармацыйныя і навучальныя цэнтры, творчыя калектывы.

Таварыству «Веды» БССР давядзецца ажыццявіць глыбокую, карэнную перабудову сваёй дзейнасці. Яна запатрабуе ад усіх арганізацый і іх членаў ініцыятывы, творчага пошуку, наватарскіх рашэнняў.

# ЦЭНТРУ СКАРЫНЫ—ЖЫЦЬ!

Здаецца, мы патроху выкараскваемся з нашай духоўнай нацыянальнай беднасці. Менавіта такое меркаванне вынікае з аднае падзеі апошняга часу. У рэспубліцы ствараецца нацыянальны навукова-асветніцкі культурны цэнтр імя Францыска Скарыны. Ужо прынята і ўрадавая пастанова. Ужо працуе і часовы камітэт па стварэнню скарынаўскага цэнтра. На чале шматграннай, шматпланавай дзейнасці яго стаіць вядомы грамадскасці рэспублікі, навуковаму савету краіны, замежных дзяржаў доктар філалагічных навук Адам Іосіфавіч Мальдзіс.

Аб клопатах будучуга цэнтра і ішла гаворка на адным з пасяджэнняў супрацоўнікаў часовага камітэта.

— Мне бачыцца, што цэнтр наш убярэ ў сябе, прадоўжыць традыцыі 20-х гадоў, традыцыі Інбелкульта, — зазначыў у сваім выступленні А. І. Мальдзіс.

Калі ўгледзецца ў кагорту людзей, якія прыйшлі ўжо на працу ў цэнтр, то няма ніякіх сумненняў: ствараецца калектыў клапатлівых аднадумцаў, што рупяцца аб беларускай культуры. Пытанні гісторыі беларускай культуры будуць весці вядомыя філосафы І. Конан, А. Бембель. Культуралогія—прадмет зацікаўленняў маладога навукоўца, празаіка Ігара Бабкова. Шмат што чалавеку цікаўнаму могуць сказаць ужо самі імёны Захара Шыбекі, Генадзя Каханоўскага, Аляксандра Лозкі, Сяргея Шупы, Вячаслава Рагойшы...

Шмат работы ў будучага цэнтра. Вучоныя мяркуюць, што скарынаўскі цэнтр стане галоўным акумулятарам, галоўнай энергазабяспечваючай крыніцай у справе зберажэння, захавання і шырокай прапаганды ўсяго беларускага.

**К. СМЕЯНОВІЧ,**
**(«Чырвоная змена», № 21).**

# ПРА НАБАЛЕЛАЕ

Складаны, крызісны час перажывае цяпер не толькі краіна, але і яе шматтысячныя перыядычныя выданні. У тым ліку і шматтыражка нашага універсітэта. У прыватнасці, яе выпуск цяпер абыходзіцца амаль у чатыры разы даражэй, а палёгкі не адчуваецца. Наадварот, становіцца ўсё цяжэй. Фабрыка «Паледрук», дзе выпускаюцца шматтыражныя газеты Гомеля, ужо даўно не адпавядае элементарным патрабаванням для нармальнай работы. Яе ўбогая матэрыяльна-тэхнічная база, недахоп высокакваліфікаваных кадраў прыводзяць да пастаяннага псавання нерваў, узнікнення спрэчак і г. д. Нашы неаднаразовыя скаргі аб дрэннай якасці паліграфічнага выканання газеты да змяненняў у лепшы бок не прывялі. Горш таго, здараюцца недарэчнасці з боку работнікаў газетнага ўчастка фабрыкі. Так, у папярэднім нумары нашай газеты на другой старонцы ў матэрыяле «Па хвалюючых пытаннях» пад подпісам яго аўтара з'явілася слова «прафесар». Гэты ж радок павінен быў стаяць пад прозвішчам А. Калугіна, матэрыял якога размяшчаўся побач. Так атрымалася з-за нявопытнасці праўшчыцы, якая гэты радок пераставіла без нашага ведама ўжо пасля таго, як паласа была вычытана.

Кожны аўторак мы паведамляем адказнаму за аўтатранспарт аб неабходнасці дастаўкі нашай шматтыражнай газеты ва універсітэт. Але Г. А. Судакоў аб гэтым, відавочна, іншы раз забываецца, бо газета прывозіцца са значным спазненнем. А 28-га мая наогул давялося шукаць прыватную машыну, каб даставіць газету сваім чытачам.

І яшчэ адна навіна, якую не назавеш прыемнай, але мы павінны аб ёй паведаміць сваім чытачам. У сувязі з вострым дэфіцытам газетнай паперы і недапастаўкай яе сёлета Гомельшчыне ў аб'ёме больш 100 тон упраўленнем па друку аблвыканкома прынята рашэнне аб скарачэнні перыядычнасці аб'яднаных, раённых і шматтыражных газет. З 1 чэрвеня наша шматтыражка будзе выходзіць 1 раз у 10 дзён.

**Калектыў рэдакцыі газеты «Гомельскі універсітэт».**

*Народны каляндар*

# ЛЕТА

Пачатак лета па календару адносіцца да 9 чэрвеня, але фактычна яно пачынаецца значна раней, і пераход ад вясны да лета ў большасці адбываецца ў другой палове або ў канцы мая; гэтак жа і заканчваецца яно — раней належнага яму часу.

Да дзён, якія маюць у чэрвені найбольшае значэнне з пункту гледжання прадказання будучага надвор'я і ўраджаю, трэба аднесці: 3 чэрвеня, які прыцягвае на сябе ўвагу назіральнікаў галоўным чынам вятрамі, 7 чэрвеня — дзень, які ўплывае на наліў жыта, 8 чэрвеня — дзень, якому прыпісваюць важнае значэнне, уплыў яго шкодны ў тым выпадку, калі ён будзе дажджлівым, і, нарэшце, самыя галоўныя дні 24 і 29 чэрвеня. Пакідаючы ў баку прыгажосць Іванава дня, за ім нельга не прызнаць важнае значэнне ў адносінах надвор'я, развіцця раслліннасці, з'яў жывёльнага жыцця. Як з дня сонцавароту прыкмячаецца ўзмацненне летняга цяпла, так з Іванава дня пачынаецца другі і часта больш дажджлівы перыяд лета.

12 чэрвеня — цвіце шыпшына.

15 чэрвеня з'яўляюцца грыбы: падбярозавікі, краснагаловікі і белыя грыбы.

23 чэрвеня — паспяваюць плады суніцы.

25 чэрвеня — цвіце язмін.

27 чэрвеня — цвіце бульба.

*Вясёлы перапынак*

# НАТАТКІ БЫЛОГА АСПІРАНТА, ЗНОЙДЗЕНЫЯ ЗА АКНОМ ПАСЛЯ БАНКЕТУ

Калі скажуць: «З Новым годам!» — не звяртай увагі, другі раз скажуць: «З Новым годам!» — таксама не турбуйся, а ўжо калі трэці раз скажуць: «З Новым годам!» — кладзі на стол дысертацыю...

• • •

Хаця навуковыя кіраўнікі перакананы, што яны сабе падбіраюць аспірантаў, на самой справе, наадварот, будучыя аспіранты выбіраюць сабе кіраўнікоў.

• • •

Часам у аспірантаў ёсць кіраўнік, але няма яшчэ тэмы; часам ёсць кіраўнік, ёсць тэма, але няма дысертацыі; але не было выпадку, каб была гатовая дысертацыя і не знайшлося б кіраўніка.

• • •

У першы дзень аспірантуры заўсёды можна напісаць першы (тытульны) ліст дысертацыі, аднак далёка не кожнаму ўдаецца ў апошні дзень аспірантуры дапісаць апошні ліст дысертацыі.

• • •

Аб'ём дысертацыі — 150 старонак, тэрмін аспірантуры — 150 тыдняў. Значыць, калі ў кожную нядзельную раніцу даць сабе працу напісаць адну старонку, то астатнія дні можна прысвяціць заслужанаму адпачынку.

• • •

Лепшы від адпачынку — турызм, лепшы від турызму — камандзіроўка, лепшая камандзіроўка — навуковая: на канферэнцыю, нараду, семінар, сімпозіум або проста так, для знаёмства.

• • •

З усіх слаёў грамадства найбольш актыўна і ахвотна знаёмяцца з людзьмі аспіранты. Водзывы на аўтарэферат дысертацыі — плады гэтай актыўнасці.

• • •

Нішто так не пашырае гарызонты і кругагляд як Аэрафлот, які абслугоўвае аспірантаў па льготнаму тарыфу.

• • •

Адным з першых аспірантаў можна лічыць Пятра І. Дзе, як не ў аспірантуры, ён змог бы адначасова асвоіць змежныя прафесіі слесара, токара, муляра і цесляра? Так што калі спытаюць: «Што паміж Пятром І і Пятром Вялікім?», адказвай: «Аспірантура».

• • •

Дысертацыю робіш сваімі рукамі. Рухаеш яе да абароны — нагамі, а адказвае за цябе кіраўнік — галавою.

• • •

Афіцыйны апанент на абароне дысертацыі — гэта абаронца ў пракурорскай мантыі.

• • •

Аспіранты прыходзяць і ўходзяць, а навука застаецца...

**(З газеты «Советский инженер» Беларускага політэхнічнага інстытута).**




**УВЫШЫНЮ ЗА ВЕДАМІ...** Фота У. Чысціка.

*Гэта цікава:*

# РАСІЯ 1912 ГОД

**Цэны ў рублях.**

**Пуд:**

мяса — 4,5; каровіна масла — 16,50; макароны — 3,10; манпасье — 6; мука пшанічная — 1,65; каўбаса — 7; кава — 34,40; кансервы мясныя — 19,50; газа — 1,50; бензін — 2,60; адэкалон — 81,50; чай — 60; пернікі — 6,70; гароднiна квашаная — 3; рыба вэнджаная — 8; цукар-рафінад — 3,25; смятана — 4; сыр — 12; халва — 8; хлеб белы — 2; хлеб чорны — 1; соль — 0,07.

**Вядро:**

квас — 0,80; спірт 40 градусаў — 0,96; піва — 1,24.

**Фунт:**

золата — 525; плаціна — 930.

**Аршын:**

тканіна льняная грубая — 0,17; тонкая — 0,55; шаўковая — 1; цюль і карункі — 0,10.

**У штуках:**

піражнае — 0,04; электралямпачка — 0,40; цэгла — 0,0015; акуляры — 1,50; папяросы — за тысячу штук — 4; паўшубак або тулуп — 10; гадзіннік кішэнны не з драгметалу — 5,65; чаравікі хромавыя — 8; дзіцячая футравая шапка — 1; папаха футравая з кенгуру — 3; веласіпед — 100; аўтамабіль — 7000; аэраплан — 9,322; бялізна пасцельная — 1.

**У бутэльках:**

каньяк тры зорачкі — 1,75; партвейн белы — 1; пшанічная — 2,20; бярозавая — 1,35; памеранцавая — 1,50; данское ігрыстае — 0,65; рускае шампанскае —2,50; цынандалі — 1; кахецінокае — 0,50; мадэра — 0,85; мускатэль — 0,45; воцат — 0,17.

Ці не праўда, цікава?

Аднак цэны яшчэ ні аб чым не гавораць, пакуль не разбярэшся ў тым, колькі людзі зарабляюць. Адказ на гэта пытанне знаходзім у кнізе «Заработная плата пры цары і цяпер», якая выйшла ў Ленінградзе ў 1928 годзе...

Як абстаяць справы «цяпер», мы ведаем, а вось пры царызме штомесячна атрымлівалі ў рублях:

токар — 52; чорнарабочы — 25; маляр — 38; слесар — 48; столяр — 47; начальнік ваенна-тэхнічнага ўпраўлення — 583; генерал для асаблівых заданняў — 312; начальнік аддзела электра-тэхнічнай часткі інжынернага ведамства — 333.

*Спорт*

# ПАДВОДЗІМ ВЫНІКІ

Вось і завяршылася круглагадовая студэнцкая спартакіяда па 11 відах спорту.

Калі гаварыць шчыра, то гэтая спартакіяда праходзіла значна складаней, чым у мінулыя гады. У першую чаргу складанасць заключаецца ў арганізацыі спаборніцтваў па відах спорту, і не апошнюю ролю тут адыграла палітычнае і эканамічнае становішча як у краіне, так і ў рэспубліцы. Згадзіцеся, што спартыўнае відовішча універсітэцкага ўзроўню прыцягне моладзь толькі тады, калі жыццёвыя і сацыяльныя праблемы адыдуць далёка за гарызонт.

Падводзячы вынікі спартакіяды, хачу падкрэсліць, што аргкамітэт не далічыўся адной трэці колькасці спаборніцтваў. Не правялі іх па баскетболу, валейболу, настольнаму тэнісу, вольнай барацьбе, зімоваму і летняму шматбор'ю ГПА, а таксама па лёгкаатлетычных эстафетах (па-за праграмай). Не буду ў гэтым абвінавачваць спартыўны клуб або спецыяльныя кафедры — на гэта ёсць шмат аб'ектыўных прычын. Гэта і загружанасць нашай адзінай спартыўнай залы, і вялікая серыя абласных, рэспубліканскіх і ўсесаюзных спаборніцтваў, дзе ўдзельнічалі студэнты нашай ВНУ (баскетбол, настольны тэніс і барацьба вольная), і фінансавыя цяжкасці.

Як і ў мінулыя гады спартакіяду выйгралі студэнты факультэта фізічнай культуры. На другой прыступцы п'едэсталу гонару студэнты фізічнага факультэта і на трэцяй — будучыя эканамісты. Далей месцы размеркаваліся так: матэматычны, геалагічны, філалагічны, гістарычны, біялагічны факультэты.

Фантастычна высокія цэны на спартформу, харчаванне ставяць бар'еры для моладзі на стадыён і ў спартыўныя секцыі. Але, як бы там ні было, трэба старацца актывізаваць студэнтаў да трэніровак і спаборніцтваў. З гэтай мэтай студэнцкаму прафкому ў сваім бюджэце ўжо неабходна прадугледжваць пэўныя сумы грошай на ўзнагароджанне не толькі пераможцаў, але і прызёраў спаборніцтваў. Таму што студэнты вялікую колькасць калорый трацяць на трэніроўках, а для таго, каб дабіцца адметных паказчыкаў ў спорце, зараз ужо мала трэніравацца штодзённа. Цяпер спартсмены высокага класа трэніруюцца па 2—3 разы ў дзень, сумарна выконваючы па аб'ёму работу лесасека. Тут лёгка ўявіць, ці доўга працягне наш «лесасек», атрымліваючы мізэрную стыпендыю.

Студэнцкаму прафкому універсітэта трэба адгукнуцца на нашы праблемы і старацца іх вырашыць.

Маючы свой санаторый-прафілакторый, трэба пастаянна, на працягу навучальнага года мець да 10 пуцёвак на кожны заезд для ўсіх факультэтаў, выкарыстоўваючы пуцёўкі для малазабяспечаных студэнтаў-спартсменаў.

На спартыўным вечары, прысвечаным вынікам чарговай спартакіяды, аднавіць былую традыцыю — узнагароджваць студэнтаў спартыўнымі касцюмамі.

У мэтах павышэння інтарэсу гледачоў, спартыўнаму клубу абмеркаваць пытанне аб правядзенні двух-трох (для пачатку) відаў спорту спартакіяды сумесна са студэнтамі БІІЧТу. Так, напрыклад, спаборніцтвы па вольнай барацьбе правесці ў БІІЧТу, а легкаатлетычныя эстафеты — на стадыёне ГДУ.

У новым навучальным годзе праўленню спартыўнага клуба неабходна самым сур'ёзным чынам (з прыцягненнем шырокай спартыўнай грамадскасці) перагледзець палажэнне аб спартакіядзе, выключыць тыя віды спорту, якія не прыцягваюць студэнтаў, дадаткова (віды па выбару) уключыць тыя, якія заўсёды выклікаюць павышаную не толькі ў гледачоў, але і ў моладзі цікавасць.

Тут нам трэба мяняць не толькі тактыку, але і стратэгію.

**В. МАРЧАНКА,**
**ст. выкладчык кафедры фізвыхавання.**

## ШАХМАТЫСТЫ—ПЯТЫЯ

У Мінску завяршыўся турнір вышэйшай лігі спартакіяды ВНУ рэспублікі па шахматах, у якім прымала ўдзел восем каманд. Пераможцамі выйшлі студэнты БДУ імя У. І. Леніна. Яны набралі 31 ачко з 42 магчымых. На тры ачкі адсталі ад іх шахматысты ІФК. Трэцім прызёрам стала каманда Беларускага інстытута народнай гаспадаркі. Шахматысты нашага універсітэта набралі 19,5 ачка і на гэты раз аказаліся на пятым месцы.

## З НОВЫМ ЗВАННЕМ!

**Дзяржкамспорт краіны прысвоіў званне «Майстар спорту СССР» вялікай групе беларускіх спартсменаў, выканаўшых гэты запаветны нарматыў. Ганаровага звання ўдастоены па стральбе кулявой студэнт факультэта фізічнай культуры нашага універсітэта Аляксандр Валагжанін.**

**Рэдактар Ул. БАЛОГА.**

**Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 1-18, тэл. 57-43-21.**

**«Гомельскі універсітэт» — газета Гомельского государственного университета им. Ф. Скорины, Гомельская фабрыка «Палесдрук» Дзяржкамітэта БССР па друку, Гомель, Савецкая,1.**

**Аб'ём — 1 друк. арк. Тыраж 1500 экз. Заказ 383. Падпісана да друку ў 14.00.**